БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_________________ А.В.Данільчанка
«_29_» _ліпеня_ 2015 г.
Рэгістрацыйны № УД-_1499_ /вуч.

# ПСІХАЛОГІЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці**
1-23 01 10-01 Літаратурная работа (творчасць)

2015

Вучэбная праграма складзена на аснове ОС РБ 1-23 01 10-01-2008 ад 02.05.2014, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі № Е 23-067 / вуч., зацверджанага 30.11.2009.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Багданава Г. Б.,** дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 12 от 18.06.2015);

Вучэбна-метадычнай камісіяй Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 3 от 19.11.2015 г.).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Псіхалогія літаратурна-мастацкай творчасці” прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца на першай ступені вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 10-01 Літаратурная работа (творчасць).

Курс “Псіхалогія літаратурна-мастацкай творчасці” знаёміць слухачоў з прыродай і спецыфікай літаратурна-мастацкай творчасці, асаблівасцямі ўспрымання і асэнсавання літаратурных і мастацкіх твораў.

У межах вывучэння курса даецца ўяўленне пра тэарэтычныя даследаванні па псіхалогіі літаратурна-мастацкай творчасці, аналізуецца псіхалогія творчасці вядомых літаратараў і дзеячаў мастацтва паводле іх уласных назіранняў і запісаў.

**Мэта** дадзенага курса – навучыць студэнтаў прафесійна працаваць над літаратурным тэкстам, ведаць прынцыпы работы пісьменніка, артжурналіста, крытыка.

Змест дадзенага курса непасрэдна звязаны з такімі гуманітарнымі дысцыплінамі як тэорыя літаратуры, гісторыя літаратуры, гісторыя мастацтваў, літаратурна-мастацкая крытыка, культуралогія, эстэтыка і інш.

Асноўныя **задачы** курса:

– вывучэнне спецыфікі псіхалогіі літаратурна-мастацкай творчасці;
– вывучэнне адметнасці нараджэння і ўспрымання вобразаў;
– аналіз індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцяў аўтараў і іх уплыву на творчы працэс;
– аваладанне сродкамі актывізацыі творчай дзейнасці.

Падчас вывучэння дысцыпліны будзе выкарыстаны неабходны навуковы інструментарый. На практычных занятках шмат увагі будзе нададзена самастойнай рабоце слухачоў.

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам.** Па заканчэнні вывучэння дысцыпліны “Псіхалогія літаратурна-мастацкай творчасці” студэнты павінны студэнты павінны

**ведаць:**

– правілы працы над мастацкім тэкстам;
– фарміраванне аўтарскага стылю і манеры пісьменніка;
– спецыфіку псіхалогіі творчасці ў выяўленчых і невыяўленчых прасторавых відах мастацтва;
– спецыфіку псіхалогіі творчасці ў часавых і прасторава-часавых відах мастацтва.

**ўмець:**

– характарызаваць літаратурна-мастацкую творчасць як спецыфічны від духоўнай дзейнасці чалавека;
– комплексна аналізаваць літаратурны твор і твор мастацтва з пункту гледжання аўтарскай задумы і яе рэалізацыі;
– канцэптуальна інтэрпрэтаваць літаратурны тэкст і мастацкі твор.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускніка, сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.** Дысцыпліна “Псіхалогія літаратурна-мастацкай творчасці” уваходзіць у цыкл дысцыплін спецыялізацый і займае важнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў дадзенага профілю, яна дапамагае актывізаваць творчы патэнцыял, прафесійна ацэньваць творы літаратуры і мастацтва. Вучэбная дысцыпліна непасрэдным чынам звязаная з такімі дысцыплінамі як “Замежная літаратура”, “Руская літаратура”, “Беларуская літаратура”, “Гісторыя мастацтваў”, “Культуралогія”, “Прафесійнае майстэрства”.

**Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі,** што выкарыстоўваюцца падчас вывучэння дысцыпліны, з’яўляюцца: культурна-гістарычны метад, параўнаўчы аналіз, выкананне самастойныя творчых заданняў, дыскусіі і г.д. Патрабаванні да арганізацыі кантралявання самастойнай работы: падрыхтоўка ўласных матэрыялаў падчас вывучэння псіхалогіі літаратурнай і мастацкай творчасці. Канчатковай формай кантролю ведаў з’яўляецца экзамен. Пры выстаўленні адзнакі за экзамен ўлічваецца наведванне семінарскіх заняткаў, выкананне творчых заняткаў і актыўнасць на занятках.

**Колькасць акадэмічных гадзін.**

| | |
|---|---|
| Факультэт | журналістыкі |
| Кафедра | літаратурна-мастацкай крытыкі |
| Курс | 5 |
| Семестр | 9 |
| Лекцыі | 10 |
| Семінарскія | 6 |
| КСР | 10 |
| Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне | 26 |
| Усяго гадзін па дысцыпліне | 52 |
| Форма бягучай атэстацыі | Залік |
| Форма атрымання вышэйшай адукацыі | Вочная |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Агульная характарыстыка і некаторыя асаблівасці літаратуры і мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці**

Агульнае і адметнае ў псіхалогіі літаратурнай і мастацкай творчасці. Агляд літаратуры па псіхалогіі творчасці. З гісторыі пытання псіхалогіі творчасці. “Свяшчэннае натхненне” Платона, “Рэалізацыя ўсвядомленай задумы”Арыстоцеля. Погляд на псіхалогію торчасці ў 18 стагоддзі(Д.Дзідро, Г.Э.Лесінг, І.Г.Гердэр). Псіхалогія творчасці вачыма нямецкіх філосафаў–ідэалістаў (І.Кант, Ф.Шэлінг, Г.Гегель). “Неўрапатычныя” канцэпцыі Ч.Ламброза, М.Нордаў, тэорыя псіхааналізу З.Фрэйда, К.Г.Юнга. “Псіхалогія творчасці” Выготскага. Размежаванне тыпаў творчых працэсаў у залежнасці ад тыпаў мыслення (рацыяналістычныя, суб’ектыўна-экспрэсіўныя, аналітычна-сінтэтычныя здольнасці). Індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці ў творчым працэсе.

Сродкі актывізацыі творчай дзейнасці.

**Тэма 2. Некаторыя аспекты літаратурнай творчасці. Правілы працы над мастацкім тэкстам**

Слова – матэрыял літаратуры. Літаратурны вымысел і домысел: суадносіны паняццяў Праблема ісціны ў пісьменніцкай творчасці. Мастацкі тэкст – тонкая пластычная субстанцыя. Лагічнае і вобразнае ў працэсе стварэння мастацкага тэксту. Тэма і ідэя. Сюжэт і фабула. Выбар і распрацоўка сюжэтнай схемы. Класіфікацыя мастацкіх дэталей у творы. Сістэма персанажаў. Кампазіцыя мастацкага вобраза. Мастацкі тэкст – тонкая пластычная субстанцыя. Лагічнае і вобразнае ў працэсе стварэння мастацкага тэксту. Беларускі пісьменнік у сучасным літаратурным працэсе.

**Тэма 3. Выпрацоўка ўластага літаратурнага стылю**

Стыль і манера: суадносіны паняццяў. Паняцце пра стылёвую плынь. Стыль як сістэма мастацкіх прыёмаў, уласцівая твору, творчасці пісьменніка, літаратурнаму напрамку, школе, аб’яднанню. Эвалюцыя стылю пісьменніка. Прынцыпы выпрацоўкі ўласнага літаратурнага стылю.

**Тэма 4. Аўтарскае “я”ў літаратуры**

Літаратурны твор – рэалізацыя творчага праекта аўтара. Твор з пункту гледжання аўтарскай задумы, псіхалогіі спасціжэння рэчаіснасці і з пункту гледжання непасрэднага чытацкага ўспрымання. Эстэтычны і інтэлектуальны кругагляд пісьменніка як асноватворны фактар літаратурнай творчасці. Спецыфіка творчай індывідуальнасці пісьменніка. Аналіз твораў замежных і беларускіх пісьменнікаў з пункту гледжання псіхалогіі творчасці. Біяграфія пісьменніка ў яго творах. Літаратурна-мастацкая крытыка і яе ўплыў на літаратурны працэс.

**Тэма 5. Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў выяўленчых прасторавых відах мастацтва. Жывапіс, графіка, скульптура, манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, фотамастацтва**

Інтуіцыя. Натхненне.Уяўленне. Іх спецыфічная трансфармацыя ў вобразнай структуры выяўленчых відаў мастацтва. Ад мастацкай задумы – да мастацкага вобраза. Аналіз спецыфікі творчасці асобных творцаў паводле іх уласных назіранняў і запісаў. Ленарда да Вінчы, Ван Гог, Радэн, Бурдэль, С.Далі, Ф.Рушчыц, сучасныя мастакі.

Нацыянальная спецыфіка і "светла-колеравыя" эталоны. Фігуратыўнае і абстрактнае мастацтва. Спецыфіка нараджэння і ўспрымання вобразаў.

Інсітнае мастацтва як феномен выяўленчай творчасці.

**Тэма 6. Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў невыяўленчых прасторавых відах мастацтва. Архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (прафесійнае і народнае), дызайн**.

Невыяўленчыя віды мастацтва. Калектыўны і індывідуальны пачатак у творчасці архітэктара, майстра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайнера. Архітэктурныя стылі як люстэрка часу і індывідувльнасці архітэктара. Калектыўны пачатак у народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Народная традыцыя. Суадносіны традыцыі і навацыі ў прафесійным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Творчая індывідуальнасць у дызайне. Сістэма аналогій і яе значэнне для фарміравання індывідуальнасці дызайнера.

**Тэма 7. Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў часавых відах мастацтва. Літаратура і музыка. Музычнае мастацтва**

Спецыфіка нараджэння і ўспрымання музычных вобразаў. Кампазітар – выканаўца –слухач. Трансфармацыя вобраза. Фальклор. Народная музычная творчасць. Музыка і масавая культура.

**Тэма 8.Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў прасторава-часавых відах мастацтва. Тэатр, кінамастацтва, цырк, харэаграфія**

Тэатральнае мастацтва. Драматург–рэжысёр–акцёр–глядач. Трансфармацыя першавобраза. Асаблівасці псіхалогіі творчасці рэжысёра і акцёра. Станіслаўскі, Брэхт, С.Эфрос, сучасныя рэжысёры і акцёры пра спецыфіку творчасці.

Кінамастацтва. Дзейнасць асобы ў творчым калектыве.

Спецыфіка цыркавога і харэаграфічнага мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці.

## УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ

| **Нумар раздзела, тэмы** | **Назва раздзела, тэмы** | **Колькасць аўдыторных гадзін** | | | | | **Колькасць гадзін КСР** | **Форма кантроля ведаў** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | **Практ. заняткі** | **Семінар. занятия** | **Лаборат. заняткі** | **Іншае** | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Агульная характарыстыка і мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці. Развіццё творчых здольнасцей чалавека | 2 | | | | | 2 | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 2. | Некаторыя аспекты літаратурнай творчасці. Правілы працы над мастацкім тэкстам | 2 | | | | | | Работа ў групах |
| 3. | Выпрацоўка ўласнага літаратурнага стылю | 2 | | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 4. | Аўтарскае “я”ў літаратуры | 2 | | | | | 2 | Дыскусія, абарона творчых работ |
| 5. | Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў выяўленчых прасторавых відах мастацтва. Жывапіс, графіка, скульптура, мануменальна-дэкаратыўнае мастацтва, | 2 | 2 | | | | 2 | Індывідуальная праверка |

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. заняткі | Семінар. занятия | Лаборат. заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | фотамастацтва | | | | | | | |
| 6. | Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў невыяўленчых прасторавых відах мастацтва. Архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (прафесійнае і народнае), дызайн | | 2 | | | | 2 | Індывідуальная праверка |
| 7. | Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў часавых відах мастацтва. Літаратура і музыка | | 2 | | | | | Работа в групах, абарона творчых работ |
| 8. | Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў прасторава-часавых відах мастацтва. Тэатр, кінамастацтва, цырк, харэаграфія | | | | | | 2 | Вуснае апытанне, дыскусія |
| | **Усяго** | **10** | **6** | | | | **10** | |

# ИНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
# РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**


1. Автор и текст: Сб. ст. / Под ред. В.М. Марковича, В. Шмида. – СПб.: Изд-во С-Петерб. ун-та., 1996. – 460 с.
2. Аймермахер К. Знак. Текст. Культура. – М.: Дом интеллектуальной книги, 1997. – 244 с.
3. Андреев Ю. Волшебное зрение (специфика литературы в современных преломлениях). – Л.: Советский писатель. Ленинградское отделение, 1990. – 432 с.
4. Батов В.И. По ту сторону слова. Очерки прикладной психогерменевтики: от Иисуса Христа до Владимира Высоцкого. – М.: МПА, 2001. – 268 с.
5. Барт Р. От произведения к тексту // Барт Р. Избранные работы: Семиотика: Поэтика. – М.: Прогресс, 1989. – С. 413–423.
6. Бахтин М.М. Эпос и роман. – СПб.: Изд-во “Азбука”. – 2000. – 304 с.
7. Белый А. Душа самосознающая. – М.: Канон+; ОИ “Реабилитация”, 2004. – 559 с.
8. Белый А. Проблема творчества: Статьи. Воспоминания. Публикации. – М.: Советский писатель, 1988. — 830 с.
9. Блум Хэролд. Страх влияния. Карта перечитывания. – Екатеринбург: Изд-во Уральского университета, 1998. — 352 с.
10. Богданов В.В. Текст и текстовое общение. – СПб.: Санкт-Петербургский ун-т, 1993. – 70 с.
11. Вежбицкая А. Язык. Культура. Познание. – М.: Русские словари, 1997. – 416 с.
12. Виноградов В.В. Проблема авторства и теория стилей. – М.: Гослитиздат, 1961. – 614 с.
13. Выготский Л.С. Психология искусства. – М., 2001. – 211 с.
14. Гніламёдаў У. Класікі і сучаснікі: Артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – 288 с.
15. де Ман, Поль. Аллегории чтения. Фигуральный язык Руссо, Ницше, Рильке и Пруста. – Екатеринбург: Изд-во Уральского университета, 1999. – 368 с.
16. Дильтей В. Описательная психология. – СПб.: Изд-во “Алетейя”. – 1996. – 155 с.
17. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. – М.: Высшая школа, 1994. – 152 с.
18. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX-XX вв: Трактаты, статьи, эссе. / Сост. К.Г.Косикова – М.: Изд-во МГУ. – 1987. – 510 с.
19. Кавалеўскі А. Крытык vs пісьменнік: артыкуляцыя суб’ектыўнасці? // Журналістыка – 2007: Матэрыялы 9-й Міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 6–7 снежня 2007 г. / Беларускі дзяржаўны універсітэт. – Мінск, 2007. – С. 384–386.

20. Кавалеўскі А. Паэзія і крытыка: спосабы і формы ўзаемадзеяння // Сучасныя аспекты развіцця беларускай журналістыкі. Выпуск 4: Зб. артыкулаў; Рэдкал.: В.П. Вараб'ёў (адк. рэд.) і інш. – Мінск, 2001. – С. 75–80.
21. Кавалеўскі А. Крытык vs пісьменнік: артыкуляцыя суб'ектыўнасці? // Журналістыка – 2007: Матэрыялы 9-й Міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 6–7 снежня 2007 г. / Беларускі дзяржаўны універсітэт. – Мінск, 2007. – С. 384–386.
22. Кавалеўскі А. Паэзія і крытыка: спосабы і формы ўзаемадзеяння // Сучасныя аспекты развіцця беларускай журналістыкі. Выпуск 4: Зб. артыкулаў; Рэдкал.: В.П. Вараб'ёў (адк. рэд.) і інш. – Мінск, 2001. – С. 75–80.

**Дадатковая:**

1. Кавалеўскі А. Сляды, меткі і памяць // Сляды, меткі і памяць: Зборнік эсэ / Уклад.: А. Кавалеўскі, С. Клюцкі, Н. Шакун. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – С. 3–8.
2. Кавалеўскі А.М. Чытацкі вопыт: асаблівасці ўспрымання і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4: Філал. Журн. Пед. – 2007. – № 1. – С. 122–128.
3. Кавалеўскі А. Чытаць – успрымаць – разумець // Тэксты – №12. – Мінск, 2009. – С. 75 – 101.
4. Ларин Б.А. Эстетика слова и язык писателя. – Л.: Художественная литература. Ленинградское отделение, 1974. – 288 с.
5. Леонтьев А.Н.Философия психологии. - М.1994.
6. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Советская энциклопедия, 1987. – 752 с.
7. Лотман Ю.М. Избранные статьи: В 3 т. – Таллинн: Изд-во "Александра", 1992. – Т.1 – 3.
8. Лихачев Д.С. Очерки по философии художественного творчества. - СПб., 1996.
9. Майер, С.Д. Псіхалогія. - Мн.1997.
10. Музыка и незвучащее / РАН. Научный совет по истории мировой культуры; МГУ им. М.В. Ломоносова. Ин-т мировой культуры; Редкол.: Е.В. Пермяков (отв. ред.) и др. –М.: Наука, 2000. – 327 с.
11. Озеров Л. Работа поэта. – М.: Советский писатель, 1963. — 336 с.
12. Сартр, Ж.П. Что такое литература? Слова. – Минск: Попурри, 1999. – 448 с.
13. Стральцоў, М. Пячатка майстра. Літ.-крытыч. артыкулы, эсэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. – 206 с.
14. Стральцоў, М. У полі зроку. Зб. літ.-крыт. артыкулаў, эцюдаў, эсэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 144 с.
15. Шмелев Д.Н. Слово и образ. – М.: Наука, 1964. – 120 с.
16. Юнг К.-Г. Aion. Исслед. феноменологии самости. – М.: Изд-во "Рефл-бук" – Киев: Изд-во "Ваклер". – 1997. – 330 с.
17. Valdes M.J. World-making: the literary truth-claim and the interpretation of texts. – Toronto; Buffalo; L.: Univ. of Toronto press, 1992. – 178 p.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Агульная характарыстыка і некаторыя асаблівасці літаратуры і мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці .
2. З гісторыі вывучэння літаратурна-мастацкай вторчасці.
3. Размежаванне тыпаў творчых працэсаў у залежнасці ад тыпаў мыслення (рацыяналістычныя, суб'ектыўна-экспрэсіўныя, аналітычна-сінтэтычныя здольнасці).
4. Некаторыя асаблівасці літаратурнай творчасці.
5. Правілы працы над мастацкім тэкстам.
6. Слова як матэрыял літаратуры.
7. Беларускі пісьменнік у сучасным літаратурным працэсе.
8. Выпрацоўка ўластага літаратурнага стылю.
9. Стыль і манера: суадносіны паняццяў.
10. Прынцыпы выпрацоўкі ўласнага літаратурнага стылю.
11. Аўтарскае "я"ў літаратуры
12. Твор з пункту гледжання аўтарскай задумы, псіхалогіі спасціжэння рэчаіснасці і з пункту гледжання непасрэднага чытацкага ўспрымання.
13. Эстэтычны і інтэлектуальны кругагляд пісьменніка як асноватворны фактар літаратурнай творчасці .
14. Літаратурна-мастацкая крытыка і яе ўплыў на літаратурны працэс.
15. Агульная характарыстыка і некаторыя асаблівасці часавых відаў мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці.
16. Некаторыя асаблівасці прасторава-часавых відаў мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці.
17. Некаторыя асаблівасці прасторавых відаў мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці.
18. Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў выяўленчых і невыяўленчых прасторавых відах мастацтва
19. Развіццё творчых здольнасцей чалавека.
20. Сродкі актывізацыі творчай дзейнасці.
21. Інтуіцыя. Натхненне.Уяўленне. Іх спецыфічная трансфармацыя ў вобразнай структуры выяўленчых відаў мастацтва.
22. Калектыўны і індывідуальны пачатак у творчасці архітэктара, майстра дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, дызайнера.
23. Калектыўны і індывідуальтны пачатак у тэатральным мастацтве.
24. Калектыўны і індывідуальны пачатак у кінамастацтве.
25. Дзейнасць асобы ў творчым калектыве.
26. Дзённікі творцаў як люстэрка псіхалогіі творчасці.
27. Спецыфіка нараджэння і ўспрымання вобразаў у розных відах мастацтва.
28. Музыка і масавая культура.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца дэканатамі, кафедрамі, выкладчыкамі вну ў адпаведнасці з Палажэннем пра самастойную работу студэнтаў якое распрацоўваецца вышайшай навучальнай установай.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў прадугледжвае:

- азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай, вучэбнай, хрэстаматыйнай літаратурай, перыядычнымі выданнямі, інтэрнэт-крыніцамі,
- выкананне вучэбна-даследчых работ, комплексных заданняў,
- падрыхтоўку рэфератаў, электронных прэзентацый, творчых работ,
- аналіз розных мастацкіх, літаратуразнаўчых, літаратурна-крытычных тэкстаў,
- ажыццяўленне аналізу мастацкага тэксту самастойна, з прымяненнем вывучаных методык.

Ацэнка самастойнай дзейнасці студэнтаў праводзіцца паводле дзесяцібальнай шкалы або ў заліковых адзінках.

**Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:**

1. Пісьмовая фома.
2. Вусна-пісьмовая форма.

Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. Вуснае апытанне.
2. Дыскусія.
3. Работа ў групах

Да пісьмовай формы дыягностыкі адносіцца:

1. Індывідуальная праверка (кантрольныя апытанні).
2. Эсэ.

Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. Абарона творчых работ.

**Пералік заданняў (эсэ).**

I. **Агульная характарыстыка і мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі творчасці. Развіццё творчых здольнасцей чалавека.**

1. Інтуіцыя. Новыя навуковыя адкрыцці па вывучэнню яе прыроды.
2. Ці можна кіраваць натхненнем?

II. **Аўтарскае “я”ў літаратуры.**

1.Даследаванне спецфікі ўласнага аўтарскага “я”.

2.Даследаванне спецыфікі аўтарскага “я” любімага пісьменніка (на выбар).

III. **Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў выяўленчых прасторавых відах мастацтва. Жывапіс, графіка, скульптура, манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, фотамастацтва.**

1. Параўнаўчы аналіз спецыфікі псіхалогіі творчасці ў жывапісу, графіцы, скульптуры.

2. Асаблівасці псіхалогіі творчасці ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве.
3. Асаблівасці псіхалогіі творчасці ў фотамастацтве (з асабістага вопыту).

IV.**Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў невыяўленчых прасторавых відах мастацтва. Архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (прафесійнае і народнае), дызайн.**

1. З лабараторыі архітэктара.
2. Калектыўны пачатак у народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Феномен традыцыі.
3. Аўтарскае "я" ў сучасным прафесійным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі.
4. Дызайн як мастацтва будучыні.

**V. Спецыфіка псіхалогіі творчасці ў прасторава-часавых відах мастацтва. Тэатр, кінамастацтва, цырк, харэаграфія.**

1. Асаблівасці працы ў творчым калектыве (тэатральнае, кінамастацтва).
2. Чаму дзеці любяць цырк?
3. Спачатку быў жэст ці слова?

# ПРАТАКОЛ САГЛАСАВАННЯ ВУЧЭБАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца сагласаванне | Назва кафедры | Прапановы пра змены ў змесце вучэбнай праграмы па дысцыпліне, што вывучаецца | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (дата, № прат.) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Руская літаратура | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 12 ад 18.06.2015 |
| Замежная літаратура | Кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 14 ад 17.06.2015 |
| Гісторыя мастацтваў | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 12 ад 18.06.2015 |
| Беларуская літаратура | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 12 ад 18.06.2015 |
| Культуралогія | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 12 ад 18.06.2015 |
| Прафесійнае майстэрства | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 12 ад 18.06.2015 |

## ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| № пп | Дапаўненні і змяненні | Аснаванне |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і ўхвалена на пасяджэнні кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі (пратакол №__ ад ____________201__г.)

Загадчык кафедры ______________ Л.П. Саянкова

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт ______ С.В.Дубовік